УДК : 908:06.7(476)323.329«1920»

А.У. Дзянісаў, асіст., кан. гіст. навук (БГТУ, г. Минск)

# УПЛЫЎ ЕЎРАПЕЙСКАГА РЭГІЯНАЛІЗМУ НА КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1920-я гг.

Регіяналізм як шырокі агульнаеўрапейскі інтэлектуальны рух сфарміраваўся ў XIX ст. у Францыі. У кароткі перыяд было створана шмат розных праграм дзейнасці рэгіянальных арганізацый. Можна казаць, што рэгіяналізм, яго прынцыпы і метады працы не засталіся без увагі ў дзеячоў краязнаўчага руху Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. У першую чаргу актыўнага дзеяча, тэарэтыка і практыка краязнаўства М.І. Касяровіча, які прысвяціў вывучэнню рэгіяналізму некалькі афіцыйных камандыровак за мяжу, а вынікі сваёй працы апублікаваў у шэрагу артыкулаў і прысвяціў гэтаму частку сваёй фундаментальнай грунтоўнай манаграфіі «Краязнаўства». Разам з тым, сярод асноўных уплываў на краязнаўчы рух можна па-ранейшаму канстатаваць расійскае краязнаўства і агульнасаюзныя тэндэнцыі ў навуковым, сацыяльна-культурным і палітычным развіцці.

Краязнаўчы рух меў даволі шмат агульных рысаў, якія аб'ядноўвалі яго з рэгіяналізмам. Абодва рухі з'яўляліся інтэлектуальнымі плынямі, абодва мелі сваёй мэтай комплекснае даследаванне тэрытарыяльнай адзінкі (паняцце край амаль тоесна паняццю рэгіён), праводзілі разнастайную дзейнасць па папулярызацыі, падтрымцы і захаванню мясцовых асаблівасцяў, вывучэнню мовы, культуры, прырода-геаграфічных умоў. Абодва ажыццяўляліся прадстаўнікамі інтэлектуальнай часткі грамадства (інтэлектуалы еўрапейскіх рэгіёнаў і інтэлігенцыя Савецкай Беларусі), абодва руха падтрымліваліся дзяржавай. З адметных рысаў можна выдзеліць тое, што краязнаўчы рух БССР быў значна больш ідэалагізаваны і цэнтралізаваны, у адрозненне ад шматлікіх, даволі аўтаномных рухаў і арганізацый Заходняй Еўропы. Нажаль, з-за палітыкі савецкіх уладаў краязнаўцы пазбавіліся магчымасці выкарыстаць вопыт еўрапейскіх рэгіяналістаў.

ЛІТАРАТУРА

1 Гужалоўскі, А. А., Бамбешка, І. І. Да пытання аб уплывах рэгіяналізму на дзейнасць краязнаўцаў Беларусі ў 1920-я гг. / А. А. Гужалоўскі, І. І. Бамбешка // Образцы прошлого в историографии: белорусского-французский диалог. Сборник материалов к междунар. науч. практ. конф.: «Историография как объект исследования». Минск, 21-22 мая 2008 г. / Ред. кол.: А. Н. Алпеев и др. – Минск: ЗАО «Веды», 2008. – 164 с.

2 Идеологическая деятельность компартии Белоруссии, 1918–1945: Сб. документов. В. 2 ч. Ч. 1. / Сост. Н.С. Сташкевич и др. – Минск: Беларусь. 1990. – 358 с.

3 Касперович, Н. И. Краеведение в Финляндии / Н. И. Касперович // Краеведение. – 1928. – № 8. – С. 482–490.

4 Касперович, Н. Краеведение у западных соседей / Н. Касперович // Советский работник. – 1928. – № 5–6. – С. 21–24.

5 Каспяровіч, М. Аб краязнаўстве на Фіншчыне / М. Каспяровіч // Наш край. – 1928. – № 4. – С. 10–21.

6 Каспяровіч, М. Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мінск: Бел. дзярж. выдавецтва, 1929. – 160 с.